## АСОБАСНЫ ПАДЫХОД І ЯГО РЭАЛІЗАЦЫЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***А.Р. Бічан*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – Б.А. Крук, канд. філал. навук, дацэнт

Праблема пераходу ад традыцыйнага да асобасна-арыентаванага навучання ў пачатковай школе як да больш эфектыўнага, знаходзіць асвятленне ў працах вучоных-метадыстаў В.У Протчанкі, М.Г. Яленскага, І.І. Паўлоўскага і інш. Асобаснае навучанне забяспечвае развіццё і самаразвіццё асобы малодшага школьніка, абапіраючыся на яго індывідуальныя асаблівасці, здольнасці, каштоўнасныя арыентацыі і суб'ектны досвед, дае магчымасць вучню рэалізаваць сябе ў пазнавальнай навучальнай дзейнасці. Ва ўмовах асобаснага навучання прынцыпова змяняецца пазіцыя вучня, істотнае месца пачынаюць займаць ролі даследчыка, арганізатара сваёй навучальнай дзейнасці. Вучань не проста прымае гатовыя веды, а актыўна ўдзельнічае ў кожным кроку свайго навучання: прымае навучальнае заданне, знаходзіць памылкі, вызначае іх прычыны і г. д. Пазіцыя настаўніка засяроджваецца на паважлівых адносінах да дзіцяці як да раўнапраўнага партнёра, на прызнанні яго ўнікальнасці, уліку індывідуальных асаблівасцяў. Паколькі ў вызначэнні асобаснага навучання падкрэсліваецца патрэбнасць ўліку асаблівасцяў яго суб'ектаў, то для педагога актуальнай з’яўляецца праблема дыферэнцыяцыі дзяцей. На наш пагляд, дыферэнцыяцыя патрэбна па наступных прычынах: а) розныя стартавыя магчымасці дзяцей; б) розныя іх здольнасці і схільнасці; в) для забеспячэння індывідуальнай траекторыі развіцця.

Базай эксперыментальнай працы паслужыла сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 1 горада Калінкавічы. У рэалізацыі эксперыментальнай праграмы ўдзельнічала пераможца раённага конкурсу «Настаўнік года» (2005) І.У. Грытчанка, якая працуе ў школе з 1986 года, мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Для рэалізацыі ключавых ідэй разам з педагогам праведзены аналіз псіхолага-педагагічнай літаратуры і канстатавальны эксперымент (для дыягностыкі асобасных асаблівасцяў навучэнцаў), апрабавана эксперыментальная мадэль уплыву асобасна-арыентаванага падыходу на эфектыўнасць працэсу навучання.

Такім чынам, працэс рэалізацыі асобаснага навучання будзе найбольш эфектыўны пры выкананні наступных умоў: а) правядзення рэгулярнага псіхолага-педагагічнага даследавання індывідуальных асаблівасцяў вучняў; б) улік гэтых асаблівасцяў пры навучанні; в) адбор матэрыялу ўрока, які дазваляе рэалізоўваць асноўную мэту асобаснага навучання – стварэнне ўмоў для развіцця асобасных функцый вучняў.

МГПУ им. И.П.Шамякина